УДК 745/749(091)(476)«19»

Н. І. Наркевіч, асістэнт

# РАЗВІЦЦЁ ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОГА МАСТАЦТВА БЕЛАРУСІ Ў ПАЧАТКУ XX СТ.

The article describes complicated processes of the decorative-applied art of Belarus at the beginning of the XX century. This period was characterized by lack of utilitary – artistic items of industrial production which caused the revival of traditional crafts and interest in folk sources of decorative-applied art. Craftsmen in Belarusian towns were well familiar with folk sources of decorative-applied art, with the history of their country. This interest was connected with general tendency of art development of the republic in the 1st decade after the revolution of October. Training professional artists and opening of educational institutions for training specialists in the field of decorative-applied art became an important stage in the development of this kind of art.

**Уводзіны.** Грамадска-палітычныя змены пасля рэвалюцыі 1917 г. спрыялі росту нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа. Значная актыўнасць назіраецца ў мастацкім жыцці рэспублікі. Праблема вывучэння і прапаганды народнага мастацтва грунтоўна разглядалася на Першай Усерасійскай канферэнцыі па мастацкай прамысловасці ў 1919 г. Трэба адзначыць і вялікую ролю ў распаўсюджванні традыцыйнага мастацтва Беларусі часопісу «Наш край», у якім друкаваліся праграмы па зборы твораў народнага мастацтва, справаздачы музеяў аб колькасці і характары сабранага матэрыялу [1, с. 91].

**Асноўная частка.** Складаныя, неадназначныя працэсы перажывае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі ў пачатку XX ст. Яго развіццё абумоўлівалі не толькі змены ў дзяржаве, але і тэхнічны стан прамысловасці. Мастацкая прамысловасць, і раней не надта развітая (пераважна шкларобчая), была ў становішчы амаль поўнага заняпаду. Некалькі ўцалелых ці адноўленых шклозаводаў выраблялі ліставое аконнае шкло, бутэлькі, гаспадарчы посуд абмежаванага асартыменту, стандартных формаў і нізкіх мастацкіх якасцей. Станаўленне новага грамадства запатрабавала стварэння новых, адпаведных часу вырабаў. Першачарговай задачай было задавальненне патрэб насельніцтва ў шкляным посудзе бытавога прызначэння. Нават завод у Барысаве толькі з 1925 г. пачынае выпускаць бытавы посуд, якасць якога была дастаткова нізкай, што тлумачыцца дэфіцытам патрэбных хімічных рэчываў, неабходнасцю хутка задаволіць высокі попыт на такія вырабы. Аднак разам з таннымі рэчамі на заводзе наладзілі выпуск і высакаякаснага посуду, які ішоў на экспарт. Работы майстроў у значнай ступені паўтаралі іх жа больш раннія ўзоры (пачатку XX ст.) або ствараліся пад уздзеяннем папулярнай плыні функцыяналізму, што прыводзіла да спрошчаных форм, мінімальнай дэкаратыўнасці [2, с. 343]. Другое значнае шкларобчае прадпрыемства – завод у пасёлку Бярозаўка (цяпер горад у Лідскім раёне Гродзенскай вобл.) – аказалася на тэрыторыі Заходняй Беларусі, уключанай у склад Польшчы. Тут у 1920-х гг. таксама шырока выкарыстоўвалі ў форме і аздобе вырабаў узоры мінулых гадоў. Толькі з пачатку 1930-х гг. назіраюцца змены, абумоўленыя ўплывамі стылістыкі канструктывізму і функцыяналізму. Яны прынеслі лаканічныя, строгія формы, гарманічнае спалучэнне буйных мас, што надало адметную выразнасць бытавому посуду.

У 1930-х гг. захоўваецца дамінаванне шкларобства ў прафесійным дэкаратыўна-прыкладным мастацтве. У гэты час дзейнічала дастаткова значная колькасць заводаў дадзенага профілю, але прадукцыю іх складалі ў асноўным аконнае і люстэркавае шкло, тарны, аптэкарскі і тэхнічнага прызначэння посуд.

На Беларусі поўнасцю адсутнічалі навучальныя ўстановы, якія б маглі забяспечыць падрыхтоўку кадраў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Не было спрыяльнай глебы і для творчасці нешматлікіх кадраў прафесіяналаў у гэтай галіне мастацтва. Іх эпізадычныя спробы адгукнуцца на новыя рэаліі тагачаснага жыцця насілі фармалістычны ці канструктывісцкі характар, што дало цікавыя вынікі ў графіцы, плакаце, архітэктуры і амаль не пакінула следу ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве [3, с. 38].

Нягледзячы на эканамічныя цяжкасці, распачынаецца дзейсны рух па падрыхтоўцы прафесійных кадраў мастакоў. Першым крокам у гэтым напрамку было адкрыццё у Віцебску народнага мастацкага вучылішча, дзе прадугледжвалася стварэнне класа прыкладнога мастацтва з майстэрняй. Да 1920-х гг. адносяцца і спробы стварэння навучальнай установы для падрыхтоўкі спецыялістаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў рэспубліцы. Гэтая задача ставілася ўжо пры стварэнні Віцебскага мастацка-практычнага інстытута, які быў адкрыты на базе мастацкай школы ў 1920 г. Навучальная ўстанова праіснавала нядоўга – у 1923 г. яна была рэарганізавана ў мастацкі тэхнікум.

Значную ролю ў развіцці айчыннага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, асабліва керамікі, адыграў М. Міхалап. З верасня 1925 г. мастак з'яўляецца выконваючым абавязкі кіраўніка

навуковай часткі Беларускага мастацкага тэхнікума ў Віцебску. Пазней ён узначальвае аддзяленне керамікі і ганчарна-керамічную майстэрню. У сваёй педагагічнай практыцы М. Міхалап імкнуўся прывіць моладзі павагу да народнага мастацтва, паказаць прыгажосць сціплых, але вельмі гарманічных вырабаў беларускіх майстроў. Заняткі вяліся ў адпаведнасці з распрацаванай сістэмай, якая ўключала поўны вытворчы працэс – ад распрацоўкі эскізаў твораў да выраба мадэляў, практычнага выканання. Цяжкасцей было дастаткова шмат: пачынаючы ад беднай навукова-тэхналагічнай базы і канчаючы адсутнасцю неабходных вучэбна-наглядных дапаможнікаў.

М. Міхалап зрабіў важны крок у вывучэнні і выкарыстанні традыцый у сучаснай кераміцы, але разам з гэтым маецца шэраг недахопаў, якія не дазволілі мастаку вырашыць дадзеную складаную задачу ў поўнай меры. Народныя ганчарныя вырабы беларускіх майстроў скупыя на дэкор і роспіс. Часцей за ўсё ў іх захаваны прыродны колер гліны. Акцэнт робіцца на выразнасці і багацці форм, пластычнай дасканаласці. М. Міхалап амаль без змен «цытуе» форму народнай керамікі і тым самым звужае кола творчых пошукаў у выяўленні новага, сучаснага. Настаўнік лічыў, што форма народнай керамікі адрозніваецца дасканаласцю, і трэба ўзбагачаць сціплы дэкор. У М. Міхалапа нярэдка сустракаюцца выпадкі кансервацыі формы твораў, выкарыстання архаічных рыс нацыянальнай культуры, што стрымлівала раскрыццё новага.

Кіраўніцтва Віцебскага мастацкага тэхнікума ў асобе М. Керзіна выступіла з прапановай аб адкрыцці на Беларусі Акадэміі мастацтваў, якая была б цесна звязана з мастацкім тэхнікумам. Планавалася, што навучальная ўстанова будзе мець мастацка-вытворчы напрамак і ўключаць ганчарна-керамічнае, графічнае і дэкаратыўна-афармiцельскае аддзяленні [1, с. 94]. Гэтыя прапановы не былі падтрыманы, што прывяло ў далейшым да ўходу таленавітай моладзі ў мастацкія вышэйшыя ўстановы Масквы і Ленінграда. Апрача таго, не было захавана і керамічнае аддзяленне. Спасылаючыся на неабходнасць эканоміі сродкаў і адсутнасць патрэбнасці ў спецыялістах мастацкай керамікі на вытворчасці, камітэту па адукацыі Беларусі было прапанавана ліквідаваць вытворчую ганчарную майстэрню. Такім чынам, наладзіць падрыхтоўку прафесійных кадраў для дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва на Беларусі не ўдалося, бо ў канцы 1929 г. аддзяленне керамікі было закрыта.

Арыентацыя на традыцыі народнага мастацтва, гісторыю сваёй краіны была характэрна ў той час для шматлікіх дзеячаў беларускай культуры. Гэта асабліва яскрава прагледжваецца ў працах М. Філіповіча, Я. Драздовіча, А. Грубэ [1, с. 95]. Некаторыя поспехі развіцця традыцыйнага прыкладного мастацтва былі прадэманстраваны на 3-й Усебеларускай выставе ў Мінску (1928).

Пэўныя станоўчыя вынікі далі ўрадавыя пастановы 1930-х гг. аб мерах па паляпшэнні работы многіх відаў прамысловасці: шкларобчай, тэкстыльнай, фарфоравай і інш. Ставілася задача як пашырэння асартыменту вырабаў, так і павышэння іх мастацкіх якасцей, актыўнага ўключэння мастака ў вытворчыя працэсы. І калі тэхнічныя праблемы пакрысе вырашаліся, то мастацкія наглядна дэманстравалі нераспрацаванасць праблематыкі, разнастайнасць думак па гэтых пытаннях, што было выклікана ў тым ліку і размежаванасцю розных галін мастацкай прамысловасці паміж рознымі ведамствамі. Нярэдка прадукцыя гэтых галін, цікавая сама па сабе, з-за living разнастылёвасці не спалучалася паміж сабою [4, с. 532–533].

Недахоп утылітарна-мастацкіх вырабаў прамысловай вытворчасці выклікаў адраджэнне традыцыйных промыслаў, якія задавальнялі патрэбы насельніцтва. Гэтыя працэсы вымушаны былі падтрымліваць і ўлады, пра што сведчыць дэкрэт УЦВК 1919 г. «Аб мерах садзеяння саматужніцкай прамысловасці» [3, с. 39].

З другой паловы 1920-х гг. пачыналася планамерная работа па арганізацыі майстроў-саматужнікаў у арцелі, што было выклікана не столькі клопатам пра іх, колькі спробаю ўзяць іх дзейнасць пад кантроль дзяржавы. Галоўным чынам гэта былі ганчарныя арцелі, і асабліва ткацка-вышывальныя, прадукцыя якіх была разлічана не толькі на ўласныя патрэбы, але і на экспарт. У 1938 г. з мэтай аб’яднання ў адзіную сістэму разрозненых майстэрань і арцеляў, якія займаліся вырабам пераважна керамічнага посуду, ткана-вышываных, вязаных рэчаў, ствараецца Беларускі мастацка-прамысловы саюз. Усё гэта станоўча адбівалася на мастацкай практыцы, рабіла яе больш разнастайнай, садзейнічала павышэнню прафесійнага ўзроўню майстроў. Прадукцыя арцеляў карысталася шырокай папулярнасцю, у тым ліку і за мяжой, экспанавалася на ўсесаюзных выстаўках, у Парыжы (1937), Нью-Йорку (1939) і інш. Шмат новых арцеляў было створана пасля 1939 г. на тэрыторыі былой Заходняй Беларусі з далучэннем яе да БССР.

Адзначаючы шырокую папулярнасць прадукцыі промыслаў, аб’яднаных у арцелі, яе поспехі на ўсесаюзных і замежных выстаўках, нельга не сказаць і пра тое, што ўжо тады ў сістэме мастацкіх промыслаў намеціліся негатыўныя працэсы, якія сталі асабліва прыкметныя ў наступныя дзесяцігоддзі. Арцелі арыентаваліся галоўным чынам на стварэнне страчавышытых вырабаў, слаба развівалася ткацтва, разьба, мастацкая кераміка. Каля трох

дзесяткаў ганчарных арцеляў у Беларускі мастацка-прамысловы саюз увогуле не ўваходзілі, займаючыся вырабам глінянага посуду чыста ўтылітарнага прызначэння.

Карэнныя змены ў жыцці грамадства, паляпшэнне бытавых умоў, павольнае, але няўхільнае насычэнне рынку прамысловымі вырабамі ўнеслі свае карэктывы ў характар народнага мастацтва, у тым ліку тых яго відаў, што не былі ахоплены каапераціяй і прадаўжалі сваё натуральнае бытаванне ў народным побыце. Адны вырабы, што страцілі свой практычны сэнс, саступілі месца прамысловым, адышлі ў мінулае, другія, наадварот, сталі набываць шырокую папулярнасць, паколькі прамысловая прадукцыя не заўсёды адпавядала мясцовым народным традыцыям і мастацкаму густу народа. У першую чаргу развіццё набываюць творы народнага мастацтва з ярка выяўленай дэкаратыўнай функцыяй, якія арганічна і натуральна ўключыліся ў традыцыйны інтэр’ер або выконвалі сувенірныя ці мастацкія функцыі. У адпаведнасці з гэтым на першы план вылучаюцца дэкаратыўныя якасці твораў народнага мастацтва і прадукцыі традыцыйных промыслаў, узбагачаюцца іх формы і дэкор.

Непапраўную шкоду дэкаратыўна-прыкладному мастацтву нанесла акупацыя Беларусі нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Спынілі сваю дзейнасць мастацкія арцелі і майстэрні, дамы народнай творчасці, былі разрабаваны ці знішчаны фонды музеяў, разбураны і так не надта шматлікія прадпрыемствы мастацкай прамысловасці. Загінула і шмат народных майстроў – захавальнікаў нацыянальных традыцый. Неабходна было аднавіць, а ў некаторых выпадках і стварыць нанава не толькі прамысловую базу, але і забяспечыць яе кваліфікаванымі кадрамі. Нягледзячы на цяжкасці, аднаўленне прамысловай базы для развіцця дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, разбуранай у гады Вялікай Айчыннай вайны, пачалося з другой паловы 1940-х гг. Былі ўзведзены нанава ці рэканструяваны такія прадпрыемствы, як Віцебскі дывановы камбінат (1946 г.), фаянсава-фарфоравы завод у Мінску (1951 г.), Аршанскі льнокамбінат (кан. 1940-х гг.), шклозаводы ў Барысаве і ў пасёлку Бярозаўка («Нёман», 1944 г.). На працягу першага пасляваеннага дзесяцігоддзя пачынаюць дзейнічаць асобныя мастацкія цэхі, арцелі, як, напрыклад, у г. п. Івянец (Валожынскі раён Мінскай вобл.) па вырабе керамікі, у г. Жлобіне (Гомельскай вобл.) па вырабе побытавых драўляных рэчаў з аплікацыяй іх саломкай. У дадзены перыяд выпускам разнастайнай прадукцыі, асноўную частку якой складаюць ткацтва, вышыўка, вязаныя і плецены рэчы, цацкі, ганчарны і драўляны такарны посуд, займаюцца прадпрыемствы Беларускага мастацка-прамысловага саюза. Гэта прадукцыя задавальняла патрэбы насельніцтва і не вылучалася высокімі мастацкімі якасцямі. У пераважнай большасці аўтараў клапаціла знешняя прыгажосць, насычанасць паверхняў дэкорам у выглядзе стылізаваных раслінных форм, геаметрычных арнаментаў.

**Заключэнне.** Трэба адзначыць, што працэс хуткага адраджэння дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва пасля вызвалення Беларусі быў досыць неаднародны і супярэчлівы. Прафесійнае прыкладное мастацтва, якое патрабавала і адпаведна падрыхтаваных кадраў, і належнай базы, не адразу змагло заняць прыкметнае месца ў пасляваенным мастацтве рэспублікі.

Асабліва вострай была праблема кадраў прафесійных мастакоў вышэйшай кваліфікацыі. З 1941 г. спецыялістаў дэкаратыўнага мастацтва пачало рыхтаваць адно Маскоўскае вышэйшае мастацка-прамысловае вучылішча (былое Строганаўскае), і толькі ў 1951 г. адкрылася Ленінградскае вышэйшае мастацка-прамысловае вучылішча імя В. І. Мухінай [2, с. 41].

Відавочна, што дастатковай колькасці спецыялістаў гэтыя навучальныя ўстановы даць не маглі. У Беларусі яшчэ доўгі час адчувалася вострая патрэба ў мастацкіх кадрах, што ў значнаў ступені паўплывала на развіццё дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

## Літаратура

1. Жук, В. И Декоративно-прикладное искусство Беларуси XVIII–XX вв.: становление и тенденции развития / В. И. Жук. – Минск: Бел. наука, 2006. – 319 с.

2. Лазука, Б. А. Гісторыя беларускага мастацтва: у 2 т. / Б. А. Лазука. – Мінск: Беларусь, 2007. – Т. II. XVIII – пачатак XXI стагоддзя. – 351 с.

3. Беларусы: у 10 т. / Я. М. Сахута. – Мінск: Бел. навука, 2005. – Т. 8: Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. – 351 с.

4. История русского искусства: в 13 т. – М.: Изд-во АН СССР, 1953–1962 / под ред. И. Э. Грабаря. –1961. – Т. XII. – С. 532–533.